УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МУЗЫКІ»

**Аб’ект аўтарскага права**
**УДК [398.33:398.8+784.68:781.7] (476-17) (043.3)**

**КАНСТАНЦІНАВА**
**Таццяна Леанідаўна**

# АБХОДНЫЯ ПЕСЕННА-ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫМ ЦЫКЛЕ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ

**Аўтарэферат**
**дысертацыі на суісканне вучонай ступені**
**кандыдата мастацтвазнаўства**
**па спецыяльнасці 17.00.02 – музычнае мастацтва**

**Мінск, 2025**

Навуковая праца выканана на кафедры гісторыі музыкі і музычнай беларусістыкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Якіменка Тамара Сямёнаўна**, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт |
| **Афіцыйныя апаненты** | **Валодзіна Таццяна Васільеўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» |
| | **Казловіч Міхаіл Іванавіч**, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, прарэктар па вучэбнай і навуковай рабоце прыватнай ўстановы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава» |
| Апаніруючая арганізацыя | установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» |

Абарона адбудзецца 21 лістапада 2025 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.01.01 пры ўстанове адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Петруся Броўкі, 22, аўд. 404; e-mail: uchsekretar@bgam.by; тэлефон вучонага сакратара (+375 29) 605 98 29.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі».

Аўтарэферат разасланы 21 кастрычніка 2025 года.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый,
кандыдат мастацтвазнаўства В. С. Царык

# УВОДЗІНЫ

Цікаўнасць да этнічных каранёў і глыбінных пластоў культуры розных народаў свету з'яўляецца заканамернай ва ўмовах крызісу ідэнтычнасці, які востра паўстаў перад чалавечым соцыумам у пачатку трэцяга тысячагоддзя. Традыцыйная музычная культура ў яе абрадавых формах, сярод якіх песенна-віншавальныя абходы каляндарна-земляробчага цыкла, – у ліку найбольш значных аб'ектаў даследчыцкай увагі.

Рытуальныя абходы, якія належаць да ўніверсалій калектыўнай свядомасці чалавецтва, звязаны не толькі з сакральным устанаўленнем мяжы сваё – чужое. У іх моцна адбіты комплекс уласцівых усім народам свету найстаражытных уяўленняў – найперш, вера ў ахоўную моц кола, ушанаванне душ памерлых продкаў. Аднак не шмат дзе абходныя традыцыі дайшлі да сучаснасці ў стане, які дазваляе правесці іх навуковае вывучэнне, рэканструкцыю, мастацкае ўзнаўленне. На гэтым фоне паўночнабеларускія тэрыторыі вылучаюцца не толькі як яркі, самабытны культурны рэгіён, дзе маштабна захоўваюцца ўсе гісторыка-стылявыя пласты народна-песеннай творчасці, але і як сапраўдны запаведнік песенных рытуальных абходаў, якія «пранізваюць» увесь гадавы цыкл абрадавых магічных практык. Асобая плённасць у даследаванні названых рытуалаў абумоўлена магчымасцю паўнавартасна назіраць іх у «жывых» формах і, як вынік, мець разнабаковае ўяўленне аб іх як з'яве. Між тым паўночнабеларускія каляндарныя абходна-песенныя практыкі дагэтуль не станавіліся аб'ектам спецыяльнага вывучэння.

Неабходнасць правядзення даследавання звязана з вырашэннем важнай навуковай задачы – раскрыццём абходных песенных традыцый у каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі як сістэмнай цэласнасці. Спроба вызначыць у гэтай сістэме месца *песенна-віншавальных абходаў* выклікала цяжкасці ў сувязі з недастатковай распрацаванасцю самога паняцця *абход*, што абумовіла разгляд пытанняў тэорыі рытуальных абходаў.

Актуальнасць тэмы даследавання звязана таксама са складанасцю культурнага «рэльефу» паўночнабеларускага рэгіёну, які сфарміраваўся ва ўмовах медыяльнага становішча на еўрапейскай прасторы, знаходжання на стыку славянскага, балцкага і фіна-ўгорскага светаў. Комплекс пытанняў, які вынікае з гэтага, патрабуе ўліку не толькі сінхроннага «зрэзу» этнапесеннай традыцыі ў яе сучасным «вымярэнні». Выкарыстанне прынцыпаў дыяхроннага аналізу дазваляе вывучаць архаічныя па паходжанні з'явы ў іх гістарычна абумоўленых межах, што, у сваю чаргу, дае магчымасць раскрыць паўночнабеларускую песенную сістэму ў аспекце дынамікі гісторыка-культурных пераўтварэнняў.

У дачыненні да песеннага кампанента паўночнабеларускіх абходаў каляндарнага замацавання спалучэнне сінхроннага і дыяхроннага падыходаў аказваецца вельмі выніковым. Па-першае, яно дае цэласнае ўяўленне аб формах музычнага напаўнення абходаў у рэаліях XX – XXI стст., дзе разам з тыпавымі напевамі раннетрадыцыйнага стылявога пласта беларускай этнапесеннай культуры прадстаўлены з'явы нефальклорнага паходжання – псальмы, жанры праваслаўнай гімнаграфіі. Па-другое, узнікае магчымасць разгляду комплексу этнакультурных пытанняў ранняга перыяду славянскай гісторыі, якія ўваходзяць у праблематыку арэальных даследаванняў.

У этнамузыкалогіі ўсталяванне арэальнага метаду адбывалася паступова і звязана найперш з імёнамі К. Квіткі, Я. Гіпіуса, Л. Мухарынскай. Неабходна прызнаць, што даследаванняў, строга выкананых у рэчышчы арэальнага падыходу (устанаўленне арэала з'явы, яго вывучэнне з пазіцый структуры, размяшчэння, утварэння, развіцця, распаду), дагэтуль няшмат. Найбольш паслядоўна гэты падыход рэалізаваны ў працах В. Прыбыловай і І. Кліменка, пры тым, што геаграфічную накіраванасць мае большасць сучасных усходнеславянскіх этнамузыкалагічных штудый. Так, у беларускай этнамузыкалогіі шырокае выкарыстанне атрымаў картаграфічны метад (З. Мажэйка, В. Ялатаў, Т. Варфаламеева, Т. Якіменка, Г. Таўлай, І. Назіна, Г. Кутырова-Чубаля, Т. Бярковіч, В. Прыбылова, Т. Заблоцкая, К. Крывашэйцава, Н. Даніловіч). Тое, як аўтары і апаненты вызначаюць кірунак такіх распрацовак, сведчыць пра існаванне маштабнай праблемы – адсутнасці размежавання арэальных і мелагеаграфічных даследаванняў, аснову якіх складае картаграфічны метад, а таксама вельмі шырокага разумення самога паняцця *арэальныя даследаванні*.

Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца першым этапам у вырашэнні акрэсленай праблемы. У сваёй структуры і інтэграцыі метадаў яна раскрывае канцэпцыю *музычнай арэалогіі*. На матэрыяле паўночнабеларускіх абходна-віншавальных напеваў каляндарна-абрадавага цыкла ў дысертацыі рэалізаваны вопыт цэласнага арэальнага даследавання, у якім гісторыка-культурная інтэрпрэтацыя з'яў ажыццяўляецца на аснове тыпалогіі іх арэалаў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Дысертацыя выканана ў адпаведнасці з перспектыўнымі планамі навукова-даследчых і навукова-метадычных работ установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» на 1996–2000 гг. (зацверджаны на пасяджэнні вучонай рады акадэміі 31.01.1996 г., пратакол № 1) і 2021–2025 гг. (зацверджаны на пасяджэнні вучонага савета акадэміі 24.03.2021 г., пратакол № 2), а таксама ініцыятыўнай навуковай тэмай кафедры гісторыі музыкі і

музычнай беларусістыкі на 2018–2022 гг. «Музычная культура Беларусі і сусветны музычны працэс: на шляху да нацыянальнай самаідэнтыфікацыі» (№ дзяржрэгістрацыі 20181481 ад 16.08.2018 г.).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэту* дысертацыі складае раскрыццё функцыянальнай, тыпалагічнай і арэальнай спецыфікі песеннага кампанента паўночнабеларускіх віншавальных абходаў каляндарна-абрадавага цыкла.

Дасягненне мэты даследавання патрабуе вырашэння наступных *задач*:

1. Вызначыць сутнасць абходу як віду рытуальна-магічных практык і тыпы абходных рытуалаў.

2. Раскрыць сістэмаўтваральную ролю абходаў у каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі, іх функцыі і дынаміку ў межах сезонаў.

3. Устанавіць спецыфіку музычнага напаўнення паўночнабеларускіх калядных абходаў, абрадавыя функцыі і тыпалогію калядных напеваў.

4. Паказаць арэальную карціну паўночнабеларускіх калядных напеваў абходнай функцыі і здзейсніць яе гісторыка-культурную інтэрпрэтацыю.

5. Выявіць спецыфіку музычнага кампанента паўночнабеларускіх велікодных абходаў, яго функцыянальныя і тыпалагічныя праявы.

6. Вызначыць арэалы валачобных напеваў паўночнабеларускай традыцыі і даць іх гісторыка-культурную інтэрпрэтацыю.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

*Аб'ект* даследавання – абходы ў каляндарна-песеннай традыцыі Паўночнай Беларусі.

*Прадмет* даследавання – песенны кампанент паўночнабеларускіх віншавальных абходаў каляндарна-абрадавага цыкла ў яго функцыянальных, тыпалагічных і арэальных характарыстыках.

**Навуковая навізна**

Дысертацыя з'яўляецца першай у этнамузыкалогіі даследчай работай, у якой рэалізавана *канцэпцыя музычнай арэалогіі* і здзейснена сістэмнае вывучэнне абходных песенна-віншавальных традыцый каляндарна-абрадавага цыкла Паўночнай Беларусі. У дысертацыі ўпершыню:

– распрацавана тэорыя рытуальнага абходу ў культуры земляробчых народаў Еўропы – дадзена дэфініцыя паняцця *абход*, вызначаны яго тыпалагічныя рады і функцыянальныя разнавіднасці;

– раскрыта сістэмаўтваральная функцыя абходаў у каляндарна-абрадавым цыкле беларускай Поўначы, дынаміка іх тыпаў у кожным сезоне;

– вызначана спецыфіка музычнага кампанента паўночнабеларускіх калядных і велікодных абходаў у рэаліях XX – XXI стст., акрэслена палітра функцыянальных значэнняў калядных і валачобных напеваў;

– створана сучасная тыпалогія паўночнабеларускіх калядных і валачобных напеваў, у якой значная ўвага нададзена ладаінтанацыйнаму параметру і лакальнай музычна-стылістычнай спецыфіцы;

– праведзена новае па падыходзе і значнае па маштабах адлюстраваных фактаў картаграфаванне каранёвых напеваў каляндарна-абрадавага цыкла Паўночнай Беларусі (калядных і валачобных) і ўстаноўлены асобы характар іх арэалаў, для вызначэння якога ўведзены тэрмін *крос-рэгіянальны арэал*;

– здзейснена *цэласнае арэальнае даследаванне* паўночнабеларускіх абходна-віншавальных песенных традыцый, якое складаюць этапы: функцыянальны, структурна-тыпалагічны, музычна-стылістычны аналіз напеваў, картаграфаванне іх тыпаў, вызначэнне структуры і канфігурацыі арэалаў, іх гісторыка-культурная інтэрпрэтацыя;

– раскрыта з пазіцыі музычнай арэалогіі спецыфіка ранняй стадыі фарміравання каляднай і валачобнай песенных традыцый беларусаў;

– даказана глыбінная сувязь традыцый Беларускага і Рускага Паазер’я на ўзроўні калядных і валачобных абходна-песенных практык; устаноўлены асобы статус песенна-абрадавай традыцыі заходнядзвінскага правабярэжжа як архаічнай па фарміраванні цэласнасці.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Абходныя рытуалы земляробчых народаў Еўропы маюць з пазіцыі культурнага тэксту і яго кодаў *агульныя асноватворныя заканамернасці*; устойлівасць акцыянальных і лакатыўных характарыстык вызначае *сутнасць* абходу як віду рытуальна-магічных практык і вылучае яго з іншых абрадавых комплексаў, заснаваных на магіі руху; спосаб рэалізацыі ідэі кола-засцярогі, спецыфіка структуры і зместу дазваляюць вылучыць два тыпы абходных рытуалаў – *абход-абкружэнне* і *абход-наведванне*. Дэфініцыя паняцця *абход – комплекснае абрадавае дзеянне, якое адбываецца ў межах колападобнага (абкружэнне) альбо сэнсава тоеснага яму (наведванне) руху выканаўцаў з мэтай замыкання прасторы і надання ёй сакральных якасцей*.

2. У паўночнабеларускай традыцыі рытуальны абход з’яўляецца *сістэмаўтваральным элементам* каляндарна-абрадавага цыкла; *дынаміка* запаўнення абходамі розных тыпаў абрадавага часу сезонаў неаднолькавая: 1) зімовы – перавага абходаў-наведванняў, замацаваных найбольш у калядны перыяд; 2) веснавы – правядзенне абходаў-наведванняў у перыяд да Юр’я, абходаў-абкружэнняў – ад Благавешчання; 3) летні – наяўнасць абодвух тыпаў абходаў, «сцягнутых» да купалля і дажынак; 4) восеньскі – разрэджанасць абходных практык пры наяўнасці рытуалаў абодвух тыпаў.

3. Існуюць *тры асноўныя разнавіднасці* калядных песенных абходаў паўночнабеларускіх тэрыторый, якія адрозніваюцца паводле спалучэння *этнаграфічных* і *музычных адзнак*: уласна калядны абход / старажытныя

абрадавыя напевы, абход з зоркай / трапар Ражства Хрыстовага, абход «Тры крулі» / калядныя псальмы. З пазіцыі *функцыянальнасці* і *музычнай тыпалогіі* калядныя напевы беларускай Поўначы з'яўляюцца абходнымі па сваёй асноўнай рытуальнай функцыі (тып I) або выконваюць абходную функцыю як адну з магчымых (тыпы II, III); *музычна-стылістычная спецыфіка* напеваў заключаецца ў прыналежнасці да «тыпу рухальнай дынамікі» (рытмы шэсця, карагода), а таксама ў захаванні рыс архаічнасці ў вобразна-інтанацыйнай (воклічнасць) і ладавай (ангемітоніка) сферах.

4. Паўночнабеларускія калядныя напевы абходнай функцыі адзначаны выразнай *арэальнай спецыфікай* (Карта 1): у межах Беларускага Паазер'я яны не фіксуюцца паўсюдна – ахопліваюць правябярэжжа Заходняй Дзвіны і заходнядзвінска-дняпроўскае міжрэчча; арэалы тыпавых калядных напеваў з'яўляюцца *крос-рэгіянальнымі – уключаюць тэрыторыі, прыналежныя дзвюм і больш рэгіянальным песенным традыцыям*; калядны песенны масіў заходнядзвінскага правабярэжжа належыць да *традыцыі архаічнага фарміравання* (геаграфічная адасобленасць, тыпалагічная монахромнасць, ладаінтанацыйныя адзнакі старажытнага генезісу ў напевах); характар этнамузычнага ландшафту бярэзінска-сожскага міжрэчча абумоўлены пашырэннем калядных напеваў розных тыпалагічных груп, якія ўтвараюць шчыльны (тып II), астраўны (тып IВ) і разарваны (тып III) па структуры арэалы – іх перакрыжаванне сведчыць пра наяўнасць у песеннай традыцыі акрэсленай тэрыторыі розных па *этнакультурных* адзнаках *музычных слаёў – ніжніх* (тыпы IВ і III) і *верхняга* (тып II); фарміраванне верхняга слоя, згодна з археалагічнымі высновамі пра міграцыйныя працэсы на ўсходнеславянскіх тэрыторыях, адбылося ў апошняй чвэрці I тыс.; гістарычным адпаведнікам суцэльнага арэала напеваў першай групы (тыпы IА, IБ, IВ) выступае паводле канфігурацыі тэрыторыя днепра-дзвінскай археалагічнай культуры ў межах III–IV стст.

5. Валачобныя напевы паўночнабеларускай традыцыі прадстаўлены асноўнымі версіямі чатырох тыпаў і значнай колькасцю лакальных тыпалагічных разнавіднасцей і падгруп; ладаінтанацыйны бок у валачобным меласе выступае *значным параметрам тыпалагізацыі*, *цэментуючым фактарам* і *сферай канцэнтрацыі лакальных праяў*. Пры існаванні ў валачобных абходна-песенных практыках асобных мясцовасцей розных тыпаў напеваў яны размежаваны па функцыянальным параметры. Велікодныя псальмы з'яўляюцца *альтэрнатыўнай формай* музычнага напаўнення паўночнабеларускіх валачобных абходаў; іх здольнасць выцясняць старажытныя абрадавыя напевы прыводзіць да *дыферэнцыяцыі абходаў* па рэпертуарных і, услед гэтаму, полаўзроставых і часавых адзнаках. Супадзенне паўночнай і ўсходняй меж арэала псальмаў з мяжой Заходняй Беларусі (1921–

1939 гг.) дазваляе разглядаць час уваходжання заходняй часткі паўночнабеларускіх тэрыторый у склад Польшчы як перыяд актыўнай трансфармацыі мясцовых валачобных абходаў.

6. Тыпавыя валачобныя напевы, характэрныя для паўночнабеларускай традыцыі (Карта 2), утвараюць розныя па структуры крос-рэгіянальныя арэалы – пераважна суцэльны шчыльны (тып I) і разарваныя (тыпы II, III, IV); *цэнтрам* валачобнага песеннага масіву беларускай Поўначы выступае заходнядзвінскае правабярэжжа, *перыферыяй* – дзісненская частка левабярэжжа Заходняй Дзвіны і міжрэчча вярхоўяў Ловаці і Вялікай; арэал валачобных напеваў тыпу I супаставімы абрысам з арэалам тушамлінскай археалагічнай культуры V–VII стст., прыметнае разбурэнне яго паўночна-заходняй і паўднёва-ўсходняй частак выклікана перасяленчымі хвалямі больш позніх часоў (фарміраванне старажытнакрывіцкай тэрыторыі, міграцыя славян з поўдня). Існаванне ў спеўных практыках асобных населеных пунктаў валачобных напеваў розных тыпаў належыць да праяў *музычнага білінгвізму.*

**Асабісты ўклад суіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыя з'яўляецца даследчай работай, якая самастойна выканана суіскальнікам; яна змяшчае вынікі, атрыманыя падчас вывучэння шырокага кола навуковай літаратуры па праблемах этнамузыкалогіі і народазнаўства ў цэлым, правядзення ўласных экспедыцыйных даследаванняў (1992–2024 гг.), работы ў этнамузычных і фальклорных архівах Беларусі, Расіі. Аўтарам дысертацыі ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак вялікі аб'ём аудыя-, транскрыбаваных нотных і тэкставых матэрыялаў з архіваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. Ва ўключаных у спіс публікацыях, якія выкананы ў сааўтарстве, суіскальнікам падрыхтаваны ўсе матэрыялы па калядных і валачобных песенна-абрадавых традыцыях.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Матэрыялы і вынікі дысертацыі былі апрабаваны ў 30 дакладах на навуковых мерапрыемствах, у тым ліку: Навук. чытанні памяці Л. С. Мухарынскай (Мінск, 1993–1998, 2004); Усерасійскі навук.-практ. семінар «Региональные исследования музыкального фольклора» (Масква, 1997); Міжнар. навук. чытанні памяці Л. С. Мухарынскай (Мінск, 2006, 2010, 2012–2020); Міжнар. навук. канф., прысвеч. 50-гадоваму юбілею ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі «Мастацтва, фальклор, этнічныя традыцыі ў вырашэнні актуальных задач сучаснай культуры» (Мінск, 2007); Міжнар. навук. канф. «Нацыянальная культура і мастацтва Беларусі ў еўрапейскім кантэксце» (Мінск, 2010); Міжнар. навук.-практ. канф. «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (Мінск, 2011, 2014, 2015); Міжнар. навук. канф. «Культура і побыт беларусаў у этнаграфічных даследаваннях і музейных

калекцыях» (Мінск, 2012); экспертна-медыйны семінар «Звуковая среда народа: проблемы сохранения и изучения звуковых фольклорных архивов России и Беларуси» (Санкт-Пецярбург, 2013); Беларуска-расійскі навук. семінар у рамках праекта БРФФД–РДНФ № Г13РП-002 (Масква, 2014); Міжнар. сімпозіум «European Voices 5: Music for Dance» (Вена, 2018); Трэці Міжнар. навук. кангрэс беларус. культуры (Мінск, 2024), Міжнар. этнамузыкалагічная канф. «Гиппиусовские чтения – 2025» (Масква, 2025).

Практычная значнасць вынікаў праведзенага даследавання пацверджана актамі ўкаранення (5 актаў) матэрыялаў дысертацыі ў вучэбныя курсы ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» – «Музычны фальклор», «Беларускі музычны фальклор», «Беларуская народная музычна-інструментальная культура», «Нотная транскрыпцыя музыкі вуснай традыцыі», «Уводзіны ў спецыяльнасць», «Методыка выкладання музычна-гістарычных дысцыплін». На аснове вынікаў даследавання былі праведзены 2 інтэрактыўныя лекцыі ў Ныцыянальнай бібліятэцы Беларусі (2019), падрыхтаваны перадачы для канала «Культура» Беларускага радыё.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі адлюстраваны ў 39 публікацыях у айчынных і замежных выданнях. Сярод іх 14 артыкулаў у рэцэнзаваных навуковых выданнях, 4 раздзелы ў калектыўных манаграфіях, 4 артыкулы ў навуковых зборніках і часопісах, 1 артыкул у энцыклапедыі, 6 артыкулаў і 2 тэзісаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 7 навукова-метадычных электронных выданняў, 1 песенны зборнік. Агульны аб’ём публікацый складае 53,55 аўт. арк. (з іх у сааўтарстве 23 аўт. арк.).

**Структура і аб’ём дысертацыі** абумоўлены яе праблематыкай і задачамі. Дысертацыя ўключае пералік скарачэнняў і абазначэнняў, уводзіны, агульную характарыстыку работы, 4 главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс (145 пазіцый), спіс публікацый суіскальніка (39 пазіцый), 4 дадаткі з каментарыямі да тэксту дысертацыі, транскрыпцыямі экпедыцыйных інтэрв’ю (107), нотна-тэкставымі транскрыпцыямі (84), картамі (16, з іх 13 – аўтарскіх). Агульны аб’ём дысертацыі – 257 старонак, з іх 116 старонак займае асноўны тэкст, 20 старонак – бібліяграфічны спіс, 121 старонку – дадаткі.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

Ва **Уводзінах** і **Агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы; фармулююцца мэта, задачы, навуковая навізна даследавання, палажэнні, якія выносяцца на абарону; прыводзіцца інфармацыя пра асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыю і апублікаванасць вынікаў даследавання, структуру і аб’ём дысертацыі.

**Глава 1 «Навуковая праблематыка і метадалагічныя асновы даследавання паўночнабеларускіх песенных абходаў»** прысвечана аналізу сучаснага навуковага ўзроўню распрацоўкі праблемы, вызначэнню дзейсных метадалагічных падыходаў у яе вырашэнні.

Раздзел **1.1 «Аналітычны агляд навуковай літаратуры»** раскрывае напрамкі і вынікі вывучэння культуры паўночнабеларускага рэгіёну і абходных рытуалаў як міждысцыплінарных аб'ектаў у народазнаўстве.

У падраздзеле **1.1.1 «Паўночнабеларускі гісторыка-культурны рэгіён у народазнаўчых даследаваннях»** асвятляецца кола праблем матэрыяльнай і духоўнай культуры Паўночнай Беларусі. У іх распрацоўцы першынство належыць археалогіі, у межах якой былі ўзняты такія вострадыскусійныя пытанні, як этнічная атрыбуцыя насельніцтва да часоў вялікай перасяленчай хвалі славян, этнічны субстрат у фарміраванні крывічоў, суадносіны славянскага, балцкага і фіна-ўгорскага кампанентаў у іх культуры, этнічная атрыбуцыя доўгіх і круглых курганоў, геаграфічныя і храналагічныя межы крывіцкага арэала, унутраны тэрытарыяльна-этнічны падзел крывічоў на лакальныя групы (Л. Аляксееў, В. Булкін, І. Дубаў, В. Енукоў, Э. Загарульскі, С. Лаул, Г. Лебедзеў, А. Мітрафанаў, В. Перхаўка, І. Русанава, А. Спіцын, В. Сядоў, С. Тараканава, П. Траццякоў, П. Чарнягін, Я. Шміт, Г. Штыхаў). Апошняе пытанне было маштабна разгорнута і на падставе лінгвістычных даных (М. Грынблат, Е. Раманаў, П. Растаргуеў А. Сабалеўскі, Х. Станг). Дыялектолагі канца ХІХ – першай чвэрці ХХ ст. далі ўяўленне пра арэал беларускіх гаворак і беларускія дыялекты, у тым ліку паўночнабеларускі (П. Альхімовіч, М. Дурнаво, Я. Карскі, Н. Сакалоў, Я. Салаўёў, Д. Ушакоў). У канцы ХХ ст. С. Нікалаеў на падставе «крывіцкіх сістэмных архаізмаў» у беларускіх і велікарускіх гаворках акрэсліў старажытную крывіцкую тэрыторыю (ІХ–Х стст.), старажытнае засяленне крывічамі ўсходу (Х–ХІІ стст.), сярэднярускі дыялектны «крывіцкі пояс» (познія міграцыі нашчадкаў крывічоў); рэканструяваў ранейшае чляненне племянной мовы крывічоў на пяць дыялектаў. Як спецыяльны аб'ект вывучэння музычная культура беларускай Поўначы паўстала ў даследаваннях З. Мажэйка, Т. Варфаламеевай, Т. Якіменка, А. Рамадзіна, аўтара дысертацыі; яна трапіла ў разгляд у працах Л. Мухарынскай, І. Назінай, А. Разумоўскай, Т. Бярковіч, Л. Белагуравай, А. Гаджыевай, І. Сіневіч, М. Казловіча, В. Прыбыловай і інш.

У падраздзеле **1.1.2 «Праблематыка вывучэння абходных рытуалаў у традыцыйнай народнай культуры»** раскрываюцца ракурсы разгляду і ступень распрацаванасці праблемы абходаў у культуры славян.

Апісанні беларускіх абходных практык шырока пададзены ў працах этнографаў рубяжа ХІХ–ХХ стст. (П. Шэйн, П. Бяссонаў, Е. Раманаў, У. Дабравольскі, Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі), дзейнасць асобных

збіральнікаў непасрэдна звязана з культурай паўночнабеларускіх тэрыторый (А. Чэрны, А. Шлюбскі, М. Нікіфароўскі). Рытуальныя абходы, як ключавы элемент традыцыйнай абрадавай культуры, аказваюцца ў цэнтры ўвагі ў сувязі з адлюстраваннем у іх старажытных культаў – салярнага і продкаў (Л. Вінаградава, Н. Вялецкая, У. Іваноў і У. Тапароў, В. Пашына, Ю. Іванова, Т. Цяпкова), вывучэннем каляндарнай абраднасці ў этнаграфічным (А. Байбурын, Т. Бернштам, Л. Вінаградава, В. Лапін, У. Проп, В. Сакалова) і этнамузыкалагічным (І. Зямцоўскі, З. Мажэйка, В. Пашына) ракурсах, пры разглядзе асобных каляндарных перыядаў і свят (Г. Таўлай, І. Сіневіч), традыцыйнай музычна-інструментальнай культуры (І. Назіна, М. Казловіч).

Сярод абходных рытуалаў усходніх славян найбольш маштабна раскрыты калядны абход (У. Проп, У. Чычараў, Л. Вінаградава, Т. Бернштам і В. Лапін). Зімовы абрадавы мелас грунтоўна разглядаецца ў этнамузыкалогіі (К. Квітка, Л. Мухарынская, З. Мажэйка, У. Гашоўскі, І. Зямцоўскі, Т. Ананічава, Т. Шэнталінская, Т. Бярковіч, аўтар дысертацыі). Вялікая навуковая цікаўнасць і шматаспектнасць падыходаў назіраюцца ў дачыненні да валачобнага абходу і яго музычнага кампанента (А. Ліс, Л. Салавей, В. Ялатаў, Л. Мухырынская, Т. Якіменка, З. Мажэйка, У. Гашоўскі, Г. Кутырова-Чубаля, Я. Шыманьска, С. Мыцько, С. Латышава, М. Мішаніч, аўтар дысертацыі).

У раздзеле **1.2 «Метадалогія даследавання»** прыводзяцца тэарэтыка-метадалагічныя асновы вывучэння паўночнабеларускіх абходных песенных традыцый. У сувязі з сістэмным характарам аб’екта і комплексным характарам праблематыкі яго даследавання абгрунтоўваецца неабходнасць выкарыстання ў дысертацыі шэрага метадаў і метадалагічных падыходаў як інтэгратыўных, вылучаюцца калядныя і валачобныя абходныя напевы як прыдатныя для раскрыцця пастаўленых этнамузыкалагічных пытанняў.

У сувязі з разглядам у дысертацыі праблемы рытуальных песенных абходаў прынцыповы характар маюць палажэнні ***агульнай тэорыі рытуалаў і абрадаў*** (В. Тэрнер, В. Іваноў, У. Тапароў, А. Байбурын, М. Талстой) і ***семіятычных даследаванняў***, у якіх распрацаваны паняцці *культурны тэкст* і *коды абраду* (М. Талстой, А. Байбурын, Г. Левінтон). Выніковым паўстае ***функцыянальна-тыпалагічны метад***, які дазволіў Л. Вінаградавай вылучыць групу рытуалаў *каляднага тыпу*, увесці катэгорыю *рытуальная мэта наведвання* і, у выніку, пераадолець стэрэатыпны погляд на абходы як на рытуалы пераважна віншавальныя па змесце.

Як кампанент сістэмы паўночнабеларускай музычнай традыцыі песенныя абходы звязаны з праблематыкай ***рэгіянальных даследаванняў***. У працах З. Эвальд, Я. Гіпіуса, З. Мажэйка, Л. Мухарынскай, Т. Якіменка, Т. Варфаламеевай грунтоўна разгледжана пытанне рэгіянальнай музычнай

традыцыі як з’явы, раскрыты песенныя традыцыі Беларусі як гістарычна шматузроўневыя і дынамічныя *музычна-культурныя сістэмы*, абгрунтавана катэгорыя *песенна-меладыйны тып*. Вывучэнне паўночнабеларускіх абходна-песенных традыцый у ракурсе музычнай тыпалогіі актуалізуе выкарыстанне ***картаграфічнага метаду***, прызнанне надзвычайных вартасцей якога з’яўляецца ў народазнаўстве кампанентам класічнай навуковай парадыгмы (М. Талстой, М. Барадзіна, С. Брук, А. Дзясніцкая). У дысертацыі плённа задзейнічаны прынцыпы *дакументальнага картаграфавання*, абгрунтаваныя ў межах украінскай этнамузыкалагічнай школы (І. Кліменка).

Паколькі каляндарныя абходна-песенныя практыкі выступаюць не толькі кампанентам рэгіянальнай музычнай традыцыі, але і этнакультурнай з’явай, якая сфарміравалася ў пэўны гістарычны перыяд і мае абумоўленыя рэаліямі гэтага часу геаграфічныя межы, асаблівае значэнне ў даследаванні набывае ***арэальны кірунак***. Лідэрства ў распрацоўцы яго тэарэтычнай праблематыкі належыць лінгвістыцы (А. Дзясніцкая, М. Барадзіна, І. Ляўкоў, Г. Бірнбаум, Г. Хаарман, Г. Цыхун). Абгрунтаванне вартасцей арэальнага падыходу ў этнамузыкалогіі зроблена ў другой чвэрці XX ст. (К. Квітка); яго методыка выкладзена ў 1980-х гг. (Я. Гіпіус).

**Глава 2 «Рытуальныя абходы ў каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі»** раскрывае паўночнабеларускія каляндарныя абходныя практыкі на аснове тэарэтычных пазіцый, распрацаваных аўтарам.

Раздзел **2.1 «Пытанні тэорыі рытуальных абходаў»** паказвае сучасны навуковы ўзровень асэнсавання з’явы і змяшчае аўтарскую тэарэтычную распрацоўку паняцця *абход*, тыпалогіі яго праяў. Аналізуюцца прычыны, адпаведна якім абход дагэтуль не стаў аб’ектам спецыяльнага даследавання ў народазнаўстве, прыводзяцца існуючыя дэфініцыі і азначэнні паняцця (Л. Салавей, А. Курачкін, В. Шарая, Т. Агапкіна, М. Валянцова, А. Леўкіеўская, Т. Цяпкова, М. Казловіч). Сфармуляваны сем палажэнняў, якія абумоўліваюць неабходнасць карэкцыі і ўдакладнення гэтага паняцця. З пазіцыі культурнага тэксту і яго кодаў найбольш значнымі ў структураванні абходу як тыпу рытуальна-магічных паводзін з’яўляюцца акцыянальны і лакатыўны параметры. Спецыфіка руху выканаўцаў у прасторы абумоўлівае існаванне двух тыпаў абходных рытуалаў з устойлівымі структурнымі і семантычнымі адзнакамі – *абход-абкружэнне* і *абход-наведванне*.

У абходах-абкружэннях сфера магічных уяўленняў непасрэдна звязана з ідэяй кола-засцярогі, а дзеянне скіравана на аб’ект, які выступае візуальным цэнтрам абраду. Такія абходы па функцыянальнай накіраванасці падзяляюцца на апатрапеічныя, катарсічныя і прадуцыравальныя. Тып абходаў-наведванняў скіраваны на адрасата, хоць аб’ект (дом, сядзіба) у ім таксама можа прысутнічаць. Ідэя кола-засцярогі рэалізуецца праз прынцып сэнсавай

роўнасці тых, на каго накіраваны абход (*усе* вяскоўцы, маладухі, нежанатыя хлопцы) – іх наведванне тоесна колападобнаму руху. Большасць такіх абходаў належыць да прадуцыравальных рытуалаў, комплекс магічных уяўленняў у іх звязаны з ушанаваннем продкаў і дараабменам; асобыя групы складаюць ахоўныя і сацыяльна-рэгламентуючыя рытуалы. Абворванне, абжынанне, апаўзанне, аб'езд, апяразванне, абкрэсліванне захоўваюць вызначальныя для абходу структурныя і семантычныя параметры і могуць разглядацца як яго *спецыфічныя разнавіднасці*. У выніку прапанавана дэфініцыя паняцца *абход.*

У раздзеле **2.2 «Музычны кампанент рытуальных абходаў»** музычны кампанент вызначаецца як адзін з асноўных абрадавых кодаў у абходных традыцыях народаў Еўропы. Роля песеннага кампанента раскрываецца праз асобую функцыянальную нагрузку, якой пазначаны «абрадавы спеў» (Т. Агапкіна, З. Мажэйка, В. Пашына). Акрэсліваецца значнасць інструментальнага кампанента ў беларускіх абходна-абрадавых практыках.

Раздзел **2.3 «Паўночнабеларускія абходныя рытуалы каляндарна-абрадавага цыкла»** прысвечаны сістэматызацыі паўночнабеларускіх абходаў адпаведна структуры земляробчага календара, функцыянальнай нагрузцы, прыналежнасці да пэўнага тыпу абходу. З этнаграфічных пазіцый разгледжаны геаграфічна паўсюдныя калядныя абходы і лакальныя ў зімовым сезоне (піліпаўскі «на Міколу», «на Сплашніцы»). У веснавым перыядзе ўвага нададзена рытуалам масленічным (абходы двароў, наведванне маладух, цяганне калодкі), на Благавешчанне і Вербны тыдзень (абходы гаспадарскіх будынкаў, агароду, азімага поля), велікодным (абходы валачобнікаў, могілак на Радаўніцу, двароў са спяваннем трапара); юраўскім (абходы двароў пастухамі, сямейны і грамадовы абходы жывёлы), абходам палёў з розным замацаваннем у лакальных традыцыях (ад Юр'я да канца русальнага тыдня). У летнім цыкле прадстаўлены абходныя рытуалы купалля (вячэрні і раняшні абходы двароў, ваджэнне ўбранай у зяляніну дзяўчыны, абходы вёскі і палёў з катаннем запаленага кола, нашэннем бараны, факелаў) і жніва (абход маладух, абход снапа-«Харытона», абжынанне «дзеда»). Сярод восеньскіх разгледжаны прымеркаваныя да раўнадзенства «Багач» і абход жывёлы.

**Глава 3 «Абходныя песенныя віншаванні паўночнабеларускай каляднай традыцыі»** раскрывае блок пытанняў, датычных *меласу* калядных абходаў беларускай Поўначы (рытуальныя функцыі, тыпалагічныя, мелагеаграфічныя характарыстыкі калядных абрадавых напеваў, іх арэалы ў ракурсах тыпалогіі і гісторыка-культурнай інтэрпрэтацыі).

У раздзеле **3.1 «Спецыфіка музычнага напаўнення паўночнабеларускіх калядна-віншавальных абходаў»** разглядаецца музычны кампанент калядных абходаў беларускай Поўначы ў рэаліях канца XIX – пачатку XXI ст., неаднароднасць якога абумоўлена функцыянаваннем

старажытных абрадавых напеваў, жанраў праваслаўнай гімнаграфіі і псальм. Раскрыта сувязь этнаграфічных асаблівасцей калядных абходаў з пэўнымі відамі песеннага напаўнення і, як вынік, вызначаны тры іх *асноўныя разнавіднасці* (уласна калядны, з зоркай, «Тры крулі»). Паказана характэрная для сучаснага стану традыцыі *тэндэнцыя* да спалучэння / перакрыжавання прыкмет акрэсленых разнавіднасцей як на акцыянальным (пераапрананне, ваджэнне зааморфных персанажаў разам з нашэннем зоркі), так і на музычным (спяванне ў час абходу абрадавых напеваў разам з царкоўнымі песнапеннямі, абрадавых напеваў і псальм, царкоўных песнапенняў і псальм) узроўні.

Раздзел **3.2 «Рытуальныя функцыі, тыпалогія і мелагеаграфія калядных абходна-віншавальных напеваў Паўночнай Беларусі»** прадстаўляе аўтарскую распрацоўку праблемы тыпалогіі калядных напеваў абходнай функцыі. Ва ўстанаўленні апошняй асаблівая ўвага нададзена аналізу вербальных тэкстаў песенных узораў і іх выканальніцкіх намінацый. Тыпалагічная карціна вылучаных калядных напеваў раскрыта з улікам кампазіцыйнага, рытмаструктурнага і ладаінтанацыйнага параметраў: тып I (IA, IБ, IВ), тып II (IIA, IIБ, IIA-1, IIA-2, IIБ-1, IIБ-2), тып III. У выніку музычна-стылістычных назіранняў акрэслены старажытныя па генезісе інтанацыйныя праявы ў напевах – ангемітоніка, ладавая шматапорнасць, воклічна-сігнальная і сугестыўна-замоўная аснова меласу. Акцэнтавана апора ў напевах абходнай функцыі на рытмы не толькі шэсця, але і карагода.

У раздзеле **3.3 «Паўночнабеларускія калядныя напевы абходнай функцыі ў іх арэальных характарыстыках»** аналізуюцца структура і ступень шчыльнасці атрыманых у выніку картаграфавання арэалаў калядных напеваў абходнай функцыі, іх суадносіны паміж сабой, з межамі рэгіянальных музычных традыцый і геаграфіяй буйных водападзелаў. Калядныя абходна-віншавальныя песенныя практыкі заходнядзвінскага правабярэжжа вызначаны як традыцыя архаічнага фарміравання паводле тыпалагічнай монахромнасці, інтанацыйнай спецыфікі, геаграфічнай адасобленасці арэалаў напеваў тыпаў IA і IB; устаноўлена кангруэнтнасць геаграфічнай праекцыі напеваў тыпу I тэрыторыі днепра-дзвінскай археалагічнай культуры ў межах III–IV ст. Уведзена паняцце *этнакультурны музычны слой* і на яго аснове дадзена гісторыка-культурная інтэрпрэтацыя арэалаў калядных напеваў тыпу II (*верхні*), тыпаў IB, і III (*ніжнія*) на бярэзінска-сожскім міжрэччы.

**Глава 4 «Абходныя песенныя віншаванні паўночнабеларускай валачобнай традыцыі»** прысвечана раскрыццю асаблівасцей музычнага кампанента валачобных абходаў Паўночнай Беларусі; функцыянальнай, тыпалагічнай і мелагеаграфічнай спецыфікі валачобных напеваў; тыпалагічных і гісторыка-культурных характарыстык іх арэалаў.

У раздзеле **4.1 «Тыпалогія і мелагеаграфія валачобных напеваў**

**Паўночнай Беларусі»** абгрунтоўваецца неабходнасць карэкціроўкі існуючых музычна-тыпалагічных распрацовак у галіне валачобнага меласу; прапануецца разгляд напеваў з улікам кампазіцыйных, структурна-рытмавых, ладаінтанацыйных, фактурных, тэмпавых адзнак. Адпаведна, валачобныя напевы беларускай Поўначы раскрыты як комплекс асноўных версій чытырох тыпаў, іх лакальных тыпалагічных разнавіднасцей і лакальных падгруп (I, I-1, I-2, $I_1$, $I_2$, $I_3$, IIА, IIБ, III, III-1, III-2, III-3, IV, IV-1), акрэслены тэрыторыі іх пашырэння. Вылучана асобая разнавіднасць антыфоннага спеву валачобных, звязанага са стрэтамі паміж партыямі пачынальніка і падхватнікаў.

У раздзеле **4.2 «Паўночнабеларускія валачобныя напевы ў іх арэальных характарыстыках»** вызначаюцца маштаб, структура і канфігурацыя арэалаў валачобных напеваў паўночнабеларускай традыцыі. На аснове геаграфічных суадносін мелаарэалаў устаноўлены цэнтр і перыферыя валачобнай абходна-песеннай традыцыі беларускай Поўначы. Пры параўнанні арэальных прастор валачобнага і каляднага меласу пацверджана дакладная структураванасць этнамузычнага ландшафту заходнядзвінскага правабярэжжа і статус апошняй як цэласнай традыцыі архаічнага фарміравання, геаграфічная прастора якой супадае з тэрыторыяй старажытных крывіцкіх пасяленняў. Паказаны супадзенні канфігурацыі арэала валачобных тыпу I і тушамлінскай археалагічнай культуры V–VII стст., суцэльнай арэальный прасторы валачобнага меласу з тэрыторыяй, паказанай на «Этнографической карте белорусского племени» (Я. Карскі, 1918).

Раздзел **4.3 «Валачобныя напевы паўночнабеларускай традыцыі ў ракурсе “музычнага білінгвізму”»** раскрывае «функцыянальны» блок пытанняў меласу валачобных песенна-абрадавых практык, якія ў сучасным стане традыцыі паказваюць аслабленне першапачатковага непарыўнага адзінства валачобнага абходу і валачобнай песні. Акрэслена палітра абрадавых функцый, якія могуць выконваць валачобныя напевы (веснавыя, у Пост, на Радаўніцу, Юр’я, Міколу, Тройцу, у перыяд да Ушэсця). Усебакова раскрыта з’ява паралельнага функцыянавання ў песенна-абрадавых традыцыях асобных населеных пунктаў двух і больш тыпавых валачобных напеваў (спалучэнне тыпаў, спецыфіка размежавання і ўваходжання ў абрадава-магічныя практыкі Вялікадня), якая вызначаецца намі як праявы *музычнага білінгвізму*.

Раздзел **4.4 «Альтэрнатыўныя формы музычнага напаўнення велікодных абходных рытуалаў»** прысвечаны праблеме функцыянавання ў валачобным абходзе з’яў нефальклорнага паходжання, сярод якіх – велікодныя псальмы. Іх разгляд праведзены на ўзрозні музычна-стылістычных і паэтычных асаблівасцей, рытуальных функцый і суадносін з абрадавымі валачобнымі напевамі. Прасочваецца трансфармацыя валачобных абходаў у сувязі з замацаваннем у іх велікодных псальм. Раскрыццё геаграфіі

псальмавых напеваў дазволіла ўстанавіць гістарычны час, у які адбываліся актыўныя змены ў валачобных песенных традыцыях заходнебеларускіх тэрыторый (1921–1939 гг.).

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Разгляд абходных практык з пазіцыі культурнага тэксту і яго кодаў (у традыцыях беларусаў, іншых славянскіх, еўрапейскіх народаў у цэлым) паказвае шматлікія абходы як з'яву з агульнымі асноватворнымі заканамернасцямі. Канстантнымі выступаюць акцыянальныя і лакатыўныя адзнакі (замыканне прасторы падчас кругападобнага / сэнсава тоеснага яму руху), якія вызначаюць сутнасць абходу як віду рытуальна-магічных практык і вылучаюць яго з іншых абрадавых элементаў, заснаваных на магіі руху – шэсця, працэсіі, карагода. Спецыфічнымі разнавіднасцямі абходу, адпаведна наяўнасці яго вызначальных структурных адзнак, варта прызнаць рытуалы абворвання, абжынання, апаўзання, аб'езду, апяразвання, абкрэслівання.

Па спосабе арганізацыі руху ў прасторы існуюць два тыпы абходных рытуалаў: абход-абкружэнне (акрэсліванне рэальнага кола) і абход-наведванне (стварэнне ўмоўнага кола ў выніку праходу праз усе «кропкі» з аднолькавай семантычнай нагрузкай). Яны здольны ахапіць усе вядомыя абходныя практыкі, раскрыць іх цэласнасць (ідэя кола-засцярогі), паказаць істотныя адрозненні на ўзроўнях структуры і зместу (аб'ект / адрасат, магічныя ўяўленні, функцыянальная накіраванасць і г. д.). Прадстаўленая факталогія дазваляе сфармуляваць дэфініцыю паняцця *абход*: комплекснае абрадавае дзеянне, якое адбываецца ў межах кругападобнага (абкружэнне) альбо сэнсава тоеснага яму (наведванне) руху выканаўцаў з мэтай замыкання прасторы і надання ёй сакральных якасцей. [6; 7; 10; 11; 28].

2. Песенна-віншавальныя абходы належаць да найбольш яркіх кампанентаў вуснатрадыцыйнай культуры Паўночнай Беларусі і з'яўляюцца сістэмаўтваральным элементам яе каляндарна-абрадавага цыкла. Сістэматызацыя абходных практык земляробчай абраднасці на паўночнабеларускіх тэрыторыях паказвае іх рэгулярнае ўзнаўленне на працягу года, уваходжанне амаль ва ўсе святочныя абрадавыя комплексы.

Абходныя рытуалы беларускай Поўначы могуць быць згрупаваны ў адпаведнасці з праяўленым у дадзенай рэгіянальнай сістэме падзелам на чатыры сезоны. Спецыфіку зімовага складае тэндэнцыя да канцэнтрацыі абходаў у каляднын святочны перыяд і перавага прадуцыравальных абходаў-наведванняў, якія, пры пэўнай адметнасці акцыянальных, прадметных і гукавых параметраў арганізацыі, вядомы паўсюдна. Веснавыя абходныя

практыкі раўнамерна разгрупаваны ў межах сезона, які доўжыцца ад Масленіцы да Тройцы; сярод іх два абходы геаграфічна паўсюдныя (валачобны, юраўскі абход жывёлы), а астатнія лакалізаваны на пэўных тэрыторыях; прадуцыравальныя і сацыяльна-рэгламентуючыя абходы-наведванні здзяйсняюцца ў адрэзак часу да Юр'я, апатрапеічныя абходы-абкружэнні – пачынаючы з Благавешчання (альбо з Вербнага тыдня). У летнім цыкле абходы прадуцыравальнай, апатрапеічнай і катарсічнай накіраванасці прымеркаваны да купалля і дажынак; належаць абодвум тыпам; не з'яўляюцца геаграфічна паўсюднымі. Нешматлікія прадуцыравальныя і апатрапеічныя восеньскія абходы, вядомыя па этнаграфічных апісаннях дарэвалюцыйнага часу, належаць да абодвух тыпаў [1; 3; 4; 6; 7; 8; 18; 28; 29; 30; 31; 33].

3. Захаванне ў рэаліях XX–XXI стст. першапачатковых сувязей паміж музычным, акцыянальным і прадметным кодамі ў калядных абходах беларускай Поўначы дазваляе вылучыць тры асноўныя іх разнавіднасці: 1) уласна калядныя абходы з выкананнем старажытных абрадавых напеваў; 2) абходы з зоркай, музычным «знакам» якіх з'яўляецца трапар Ражства Хрыстовага; 3) абходы «Тры крулі» са спяваннем калядных псальм.

Функцыянальны і тыпалагічны аналіз музычнага кампанента ўласна калядных абходаў Паўночнай Беларусі паказвае наяўнасць групы калядных напеваў, якія з'яўляюцца абходнымі па сваёй асноўнай рытуальнай функцыі і музычна-стылістычных параметрах (тыпы IА, IБ, IВ). У музычнай стылістыцы калядных напеваў іншых груп (тыпы IIА, IIБ, III, разнавіднасці IIА-1, IIА-2, IIБ-1 і IIБ-2) адзнакі «абходнасці» менш праяўлены. Такія напевы могуць існаваць у розных абрадавых кантэкстах, у тым ліку ў абходзе, што дае падставы разглядаць іх як напевы абходнай функцыі.

Музычна-стылістычная спецыфіка паўночнабеларускіх калядных напеваў раскрываецца на розных узроўнях. Па рытмаструктурнай арганізацыі ўсе яны належаць да «тыпу рухальнай дынамікі» і звязаны з рытмікай шэсця (тып I), карагода (тыпы II, III). У іх вобразна-інтанацыйнай сферы ярка праяўлена воклічнасць (квартавыя воклічы – тыпы I, II, квінтавыя – тыпы II, III, секставыя – тып III), сігнальная прырода якой сведчыць аб захаванні ў інтанацыйным «слоўніку» паўночнабеларускай каляднай традыцыі найстаражытнага слоя. Да рыс архаічнасці належыць і ангемітоніка, акая адыгрывае значную ролю ў ладавай арганізацыі напеваў тыпу I. Воклічнасць у напевах спалучаецца з дэкламацыйнасцю – устойлівым драбленнем асноўных адзінак рытмаформулы вершарадка (тыпы I, III), насычанасцю песенна-паэтычных тэкстаў эпічнымі наратывамі [5; 9; 17; 19; 23; 27; 30; 32; 33; 34; 35; 37; 38].

4. У адпаведнасці з арэальным падыходам у даследаванні музычнага кампанента ўласна калядных абходаў вызначаны тэрыторыя пашырэння

калядных напеваў абходнай функцыі ў межах паўночнабеларускай рэгіянальнай традыцыі (заходнядзвінскае правябярэжжа і заходнядзвінска-дняпроўскае міжрэчча) і крос-рэгіянальныя арэалы трох іх тыпалагічных груп; устаноўлена некангруэнтнасць тэрыторыі паўночнабеларускай і сумежных рэгіянальных этнамузычных традыцый з арэаламі старажытных калядных напеваў. Паказана роля буйных водных артэрый (Заходняя Дзвіна, Днепр, Бярэзіна, Сож) і іх прытокаў як моцнага фактара структуравання арэалаў шэрагу калядных напеваў (тыпаў IА, IБ, IIА, IIБ), у тым ліку выразнае размежаванне арэала напеваў другой групы на «паазерскую» (IIБ) і «падняпроўскую» (IIА) часткі па цячэнні Дняпра. Вызначана прыналежнасць калядных абходных песенных практык правабярэжжа Заходняй Дзвіны да традыцыі архаічнага фарміравання, зыходзячы з тыпалагічнай монахромнасці яе калядных песенных форм, геаграфічнай адасобленасці іх арэалаў, наяўнасці ў напевах вялікай колькасці ладаінтанацыйных адзнак старажытнага паходжання. Раскрыты складаны характар этнамузычнага ландшафту бярэзінска-сожскага міжрэчча, які абумоўлены функцыянаваннем калядных напеваў розных тыпалагачных груп. Іх адметныя па структуры арэалы (шчыльны – тып II, астраўны – тып IВ, разарваны – тып III) перакрыжоўваюцца на значнай геаграфічнай прасторы. Прапанавана інтэрпрэтацыя акрэсленай сітуацыі з пазіцыі прыналежнасці гэтых арэалаў да розных па этнакультурных адзнаках музычных слаёў бярэзінска-сожскага міжрэчча – верхняга (тып II) і больш глыбокіх ніжніх (тыпы IВ і III). Устаноўлены, згодна з геаграфічнай канфігурацыяй, гістарычны адпаведнік сумеснага арэала калядных напеваў першай тыпалагічнай групы – днепра-дзвінская археалагічная культура ў межах III–IV ст. Такая заглыбленая гістарычная праекцыя пацвярджаецца разбурэннем арэала разнавіднасці IВ у выніку налажэння больш «маладога» этнамузычнага культурнага слоя (арэал напеваў тыпу II), сфарміраванага носьбітамі культуры, якія трапілі на бярэзінска-сожскае міжрэчча падчас перасяленчай хвалі з поўдня ў апошняй чвэрці I тыс. [9; 17; 19; 25; 26; 27].

5. У тыпалагічным ракурсе валачобныя напевы беларускай Поўначы разгледжаны як комплекс асноўных версій чатырох тыпаў, лакальных тыпалагічных разнавіднасцей і лакальных падгруп паводле кампазіцыйных, структурна-рытмавых, ладаінтанацыйных, фактурных, тэмпавых адзнак; дыскрэтнасцю адзначаны першая (I, I-1, I-2, $I_1$, $I_2$, $I_3$) і трэцяя (III, III-1, III-2, III-3) тыпалагічныя групы, большай маналітнасцю – другая (IIА, IIБ) і чацвёртая (IV, IV-1). Ладаінтанацыйны бок выступае значным параметрам у тыпалагізацыі напеваў (устойлівыя меладыйныя звароты ў напевах тыпаў I, III, заканамернасць апорных тонаў у мелабудове тыпу IV), цэментуючым фактарам валачобнай традыцыі (агульная ладагукарадная аснова) і сферай

канцэнтрацыі яе лакальных праяў (тыпалагічныя разнавіднасці і падгрупы).

Выніковым у раскрыцці праблемы адначасовага існавання ў спеўных традыцыях асобных мясцовасцей валачобных напеваў розных тыпаў (I / II, II / III, III / IV, I / IV, I / III / IV, I / I-1 / II / III) стаў іх разгляд праз прызму рытуальных функцый другога і трэцяга рангаў. Згодна з выканальніцкімі намінацыямі, размежаванне напеваў можа адбывацца па месцы выканання, па адрасату, па яго нацыянальнай або канфесійнай прыналежнасці. Устойлівасць валачобных напеваў, як асноўнай формы музычнага напаўнення паўночнабеларускіх велікодных абходаў, не выключае існавання ў традыцыі на сучасным этапе геаграфічна лакалізаваных альтэрнатыўных форм – пасхальнага трапара і велікодных псальм. З пашырэннем апошніх звязаны працэсы выцяснення валачобных напеваў з абходных практык (набыццё псальмамі функцыі галоўнай падваконнай песні, адсоўвання старажытных напеваў у межы «разгорнутага этапу» рытуалу) і дыферэнцыяцыі абходаў па рэпертуарных, полаўзроставых, часавых адзнаках (псальмы /дзеці / да абеду і валачобныя / мужчыны / пасля абеду). Велікодныя псальмы канцэнтруюцца на заходняй частцы паўночнабеларускіх тэрыторый; абрыс іх арэала на поўначы і ўсходзе супадае з палітыка-адміністрацыйнай мяжой Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.), што дае падставы вызначыць час уваходжання беларускіх тэрыторый у склад Польшчы як перыяд актыўнай трансфармацыі мясцовых валачобных песенных традыцый [2; 12; 13; 14; 15; 20; 21; 22; 23; 24; 32; 33; 34; 35; 36; 37; 38].

6. У выніку картаграфавання валачобных напеваў паўночнабеларускай традыцыі ўстаноўлены крос-рэгіянальныя арэалы рознага маштабу і структуры: пераважна суцэльны (тып I) і тры разарваныя (тыпы II III, IV). Выяўлена супадзенне канфігурацый арэалаў валачобных першай групы і тушамлінскай археалагічнай культуры V–VII стст. Акрэслены магчымыя шляхі ўтварэння дыферэнцаванай па тыпалагічных праявах паўночна-заходняй часткі валачобнага меламасіву (міграцыя на поўдзень насельніцтва з арэала культуры пскоўскіх доўгіх курганоў у канцы VII – VIII ст., адпаведнасць лінгвістычным высновам адносна полацкага і паўднёвапскоўскага дыялектаў крывіцкай племяннoй мовы) і яго паўднёва-ўсходняй часткі (міграцыі насельніцтва ў апошняй чвэрці I тыс.). Акрэслена геаграфічная дынаміка лакалізацыі валачобных, галоўная асаблівасць якой – выразная мяжа судатыкнення арэалаў напеваў тыпаў I і II, яе супадзенне з мяжой смаленскага і полацкага дыялектаў племяннoй мовы крывічоў.

Цэнтр паўночнабеларускага валачобнага песеннага масіву (згодна з пашырэннем асноўных разнавіднасцей напеваў тыпаў II, III, IV і геаграфічнай адасобленасцю іх арэалаў) прыпадае на заходнядзвінскае правабярэжжа, што, як і ў выпадку калядных напеваў, сведчыць пра існаванне традыцыі архаічнага

фарміравання, а таксама пра непарыўнасць этнамузычнай культуры Беларускага і Рускага Паазер'я. Перыферыяй выступаюць дзісненская частка левабярэжжа Заходняй Дзвіны (перасячэнне арэалаў напеваў тыпаў I, II, III, IV, разнавіднасцей I-1, I-2, III-1, III-3, падгруп $I_1$, $I_2$, $I_3$) і міжрэчча вярхоўяў Ловаці і Вялікай (разнавіднасці III-2, IV-1). Паралельнае існаванне ў песенна-абрадавых традыцыях асобных мясцовасцей некалькіх тыпавых валачобных напеваў належыць да праяў музычнага білінгвізму [16; 20; 22; 26; 36].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Атрыманыя вынікі могуць стаць метадалагічнай асновай распрацовак у сферы музычнай арэалогіі, тэарэтычнай базай пры вывучэнні абходных рытуалаў у розных галінах народазнаўства. Палажэнні даследавання могуць быць карыснымі пры распрацоўцы праблем тыпалогіі, рэгіяналістыкі, жанрава-функцыянальнай і лакальна-стылявой спецыфікі этнамузычных традыцый. Вынікі дысертацыі могуць выкарыстоўвацца на лекцыйных і практычных занятках вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі гуманітарнага профілю, для стварэння вучэбнай і даведачнай літаратуры, пры распрацоўцы стратэгіі і мерапрыемстваў па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Матэрыялы дысертацыі, уключаныя ў аўдыякалекцыі, могуць быць задзейнічаны ў вырашэнні шырокага спектра адукацыйных, выхаваўчых, мастацка-эстэтычных і культурна-асветніцкіх задач.

## Карта 1. Арэалы калядных напеваў абходнай функцыі



# Карта 2. Арэалы валачобных напеваў



## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

*Раздзелы ў манаграфіях:*

1. Канстанцінава, Т. Л. Песні з умоўным прымеркаваннем па часе і абставінах выканання / Т. Л. Канстанцінава // Беларусы : у 13 т. / НАН Беларуси, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал. : М. Ф. Пілiпенка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск, 1995–2012. – Т. 11 : Музыка / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – 2008. – С. 89–118.

2. Музычная культура / нотная транскр. фоназапісаў, сістэматызацыя песняў, камент. і ўступ. арт. Т. Канстанцінавай // Санько, З. Слаўнае сяло Азярычына: свет нашых продкаў / З. Санько, Ю. Санько. – Мінск, 2019. – С. 197–312.

3. Константинова, Т. Изучение восточнославянских региональных народно-песенных традиций в рамках комплексных этнокультурных исследований / Т. Константинова // Экспедиционно-полевое исследование региональных этномузыкальных традиций Беларуси в современных условиях / Т. Беркович [и др.] ; науч. ред. Т. Беркович, Т. Константинова. – Минск, 2020. – С. 14–22.

4. Константинова, Т. Специфика экспедиционного музыкально-этнографического обследования региона Белорусское Поозерье / Т. Константинова // Экспедиционно-полевое исследование региональных этномузыкальных традиций Беларуси в современных условиях / Т. Беркович [и др.] ; науч. ред. Т. Беркович, Т. Константинова. – Минск, 2020. – С. 87–91.

*Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых выданнях:*

5. Канстанцінава, Т. Зімовыя абходна-абрадавыя песенныя віншаванні крывіцкага арэала / Т. Канстанцінава // Беларускі музычны фальклор у даследаваннях маладых этнамузыколагаў : зб. арт. / Беларус. акадэмія музыкі ; уклад. і адк. рэд. Т. С. Якіменка. – Вып. 2. – Мінск, 1996. – С. 5–21.

6. Канстанцінава, Т. Абходы ў сучаснай народна-песеннай культуры паўночнай Беларусі / Т. Канстанцінава // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2001. – № 1. – С. 7–9.

7. Канстанцінава, Т. Паўночнабеларускія абходна-песенныя рытуалы як аб'ект этнарэгіянальнага даследавання / Т. Канстанцінава // Вопросы музыкознания и философии музыки : сб. ст. молодых исследователей / Белорус. гос. академия музыки ; сост. Т. А. Щербакова. – Минск, 2003. – С. 112–118.

8. Канстанцінава, Т. Культура крывіцкага этнаарэала: Падыходы. Праблемы вывучэння / Т. Канстанцінава // Беларускі музычны фальклор у даследаваннях маладых этнамузыколагаў : зб. арт. / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; уклад. і навук. рэд. Т. С. Якіменка. – Вып. 3. – Мінск, 2004. – С. 5–34.

9. Канстанцінава, Т. Удакладненне геаграфічных межаў рэгіянальных музычных традыцый Беларусі як метадалагічная праблема / Т. Канстанцінава // Навук. пр. / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі. Сер. 1, Беларус. музычная культура. – Мінск, 2005. – Вып. 8 : Старонкі гісторыі беларускай музыкі. – С. 4–14.

10. Канстанцінава, Т. Катэгорыя «абход» у вывучэнні абрадавых песенных практык беларусаў / Т. Канстанцінава // Навук. пр. / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі. Сер. 1, Беларус. музычная культура. – Мінск, 2006. – Вып. 12 : Музычная культура Беларусі і свету: да 100-годдзя Л. С. Мухарынскай. – С. 67–76.

11. Канстанцінава, Т. Л. Рытуальныя абходы ў традыцыйнай абрадавай культуры славян: погляд на праблему з пазіцыі сучаснай народазнаўчай навукі / Т. Л. Канстанцінава // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларуси, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Вып. 3 : у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск, 2007. – С. 111–116.

12. Канстанцінава, Т. Л. Да пытання адначасовага функцыянавання розных тыпаў валачобных напеваў у мясцовых песенна-абрадавых традыцыях паўночнабеларускага рэгіёна / Т. Л. Канстанцінава // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларуси, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Вып. 7. – Мінск, 2009. – С. 135–143.

13. Канстанцінава, Т. Л. Велікодныя псальмы ў песенна-абрадавых традыцыях беларускай Поўначы / Т. Л. Канстанцінава // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2010. – № 16. – С. 11–17.

14. Канстанцінава, Т. Л. З экспедыцыйных назіранняў над сучаснымі песенна-абрадавымі практыкамі каляндарна-земляробчага і сямейна-радавога цыклаў Міёршчыны / Т. Л. Канстанцінава, Т. Л. Бярковіч // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2011. – № 18. – С. 4–9.

15. Канстанцінава, Т. Л. Беларускія народныя музычныя традыцыі ў ІІІ тысячагоддзі: экспедыцыйнае вывучэнне песенна-інструментальнай культуры Сенненшчыны / Т. Л. Канстанцінава, В. М. Прыбылова // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2013. – № 23. – С. 38–50.

16. Канстанцінава, Т. Л. Аб уздзеянні міграцыйных працэсаў другой паловы ХХ ст. на этнамузычны ландшафт Беларусі / Т. Л. Канстанцінава // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2017. – № 30. – С. 13–18.

17. Канстанцінава, Т. Л. Калядныя напевы Бярэзінска-Сожска-Заходнедзвінскага міжрэчча / Т. Л. Канстанцінава // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларуси, Ін-т

мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Вып. 28. – Мінск, 2020.– С. 157–163.

18. Константинова, Т. Л. Северобелорусские купальские напевы в свете ареального подхода / Т. Л. Константинова // Науч. тр. / Белорус. гос. академия музыки. – Минск, 2021. – Вып. 52 : Музыкальная культура Беларуси и мира: актуальные проблемы этномузыкологии, истории музыки, педагогики. – С. 3–21.

*Арыкулы ў навуковых зборніках і часопісах:*

19. Константинова, Т. Л. Колядные напевы северобелорусской традиции в их ареальных характеристиках: к вопросу географических границ региональной музыкальной системы / Т. Л. Константинова // Северобелорусский сборник: обряды, песни, наигрыши, плачи, ворожба / Рос. ин-т истории искусств ; ред.-сост. А. В. Ромодин ; редкол.: В. В. Виноградов, С. В. Кучепатова, Г. В. Тавлай. – СПб., 2012. – С. 4–14.

20. Канстанцінава, Т. Валачобныя напевы паўночнабеларускай традыцыі : арэальны аспект / Т. Канстанцінава // Проблеми етномузикології : зб. наук. ст. з геогр. атласом / Нац. муз. академія України, Проблемна наук.-дослід. лаб. по вивченню нар. муз. творчості. – Київ, 2013. – Вип. 8. – С. 81–89 ; К 6–7, 8а. – (Серія «Слов'янська мелогеографія» ; кн. 4).

21. Константинова Т. О существовании «белых пятен» на карте восточнославянских этнопесенных традиций (из экспедиционных наблюдений 2013 года) / Т. Константинова, В. Прибылова // Вопросы этномузыкознания. – № 4(5). – 2013. – С. 120–129.

22. Константинова, Т. Волочёбные напевы в песенно-обрядовых традициях северобелорусских территорий: к вопросу одновременного функционирования двух и более типов / Т. Константинова // Вопросы этномузыкознания. – № 1(6). – 2014. – С. 71–89.

*Артыкулы ў энцыклапедыях:*

23. Канстанцінава, Т. Л. Формульны напеў / Т. Л. Канстанцінава // Беларускі фальклор: энцыкл. : у 2 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. І. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 681–682.

*Матэрыялы канферэнцый:*

24. Канстанцінава, Т. Л. Валачобныя песенныя віншаванні крывіцкага арэала / Т. Л. Канстанцінава // Музычная культура Беларусі: традыцыі і сучаснасць : тэз. дакл. IV навук. чытанняў памяці Л. С. Мухарынскай, Мінск, 5 крас. 1995 г. / Беларус. акадэмія музыкі. – Мінск, 1996. – С. 7–9.

25. Константинова, Т. О перспективах этномузыковедческого изучения кривичского этнокультурного ареала / Т. Константинова // Славянская этномузыкология: Направления. Методы. Концепции : тез. докл. Междунар. науч. конф. к 90-летию Л. С. Мухаринской (1906–1987), 23–26 окт. 1996 г. /

Белорус. гос. академия музыки ; сост. И. Д. Назина, Т. С. Якименко. – Минск, 1996. – С. 126–128.

26. Канстанцінава, Т. Арэальныя даследаванні як метад сучаснай этнамузыкалогіі / Т. Канстанцінава // Музычная культура Беларусі: дыялог часоў : матэрыялы VI навук. чытанняў памяці Л. С. Мухарынскай (1906–1987), Мінск, 4 крас. 1997 г. / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. і навук. рэд. І. Д. Назіна, Т. С. Якіменка. – Мінск, 1997. – С. 83–88.

27. Канстанцінава, Т. Аб функцыянальным змесце і рэгіянальнай прыналежнасці некаторых тыпаў беларускіх калядных напеваў / Т. Канстанцінава // Музычная культура Беларусі: пошукі і знаходкі : матэрыялы VII навук. чытанняў памяці Л. С. Мухарынскай (1906–1987), Мінск, 8–10 крас. 1998 г. / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. і навук. рэд. В. У. Дадзёмава, І. Д. Назіна, Т. С. Якіменка. – Мінск, 1998. – С. 24–31.

28. Канстанцінава, Т. Абходы ў каляндарна-земляробчай традыцыі беларусаў / Т. Л. Канстанцінава // Музычная культура Беларусі: праблемы гісторыі і тэорыі : матэрыялы VIII навук. чытанняў памяці Л. С. Мухарынскай (1906–1987), Мінск, 9 крас. 1999 г. / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. і навук. рэд. І. Д. Назіна. – Мінск, 1999. – С. 56–72.

29. Константинова, Т. Л. К вопросу этномузыкологического изучения территорий белорусско-балтского пограничья / Т. Л. Константинова // Роля традыцыйнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., 24 верас. 2010 г., г. Іванава / НАН Беларуси, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; гал. рэд. А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 125–128.

30. Канстанцінава, Т. Л. Экспедыцыйныя даследаванні традыцыйнай музычнай культуры Сенненшчыны ў святле праблематыкі вывучэння лакальных асаблівасцяў народна-песенных традыцый / Т. Л. Канстанцінава // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 10–11 ліст. 2011 г. / НАН Беларуси, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал. : А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 125–130.

31. Канстанцінава, Т. Л. Сучасныя абходна-песенныя практыкі Вялікадня на паўночна-заходніх беларускіх тэрыторыях / Т. Л. Канстанцінава // Культура и быт белорусов в этнографических исследованиях и музейных коллекциях : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 7–8 июня 2012 г. / НАН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; редкол. : А. И. Локотко (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2012. – С. 158–161.

*Навукова-метадычныя электронныя выданні:*

32. Этнамузычныя традыцыі паўночнабеларускага рэгіёна: Сенненшчына [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ;

склад. Т. Канстанцінава, В. Прыбылова. – Мінск, 2014. – 2 электрон. апт. дыскі (CD-ROM) : гуч., брашура (32 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі ; вып. 5).

33. Каляндарна-песенная традыцыя паўночнабеларускага рэгіёна ў экспедыцыйна-палявых запісах Т. С. Якіменка [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. Т. Бяркові́ч, Т. Канстанцінава, В. Прыбылова. – Мінск, 2016. – 2 электрон. апт. дыскі (CD-ROM) : гуч., брашура (39 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі ; вып. 7).

34. Этнамузычныя традыцыі ўсходнебеларускага рэгіёна: Чавушчына [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. Т. Бяркові́ч, Т. Канстанцінава, В. Прыбылова. –Мінск, 2016. – 2 электрон. апт. дыскі (CD-ROM): гуч., брашура (31 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі ; вып. 8).

35. Народны спявак-карыфей са Шклоўшчыны Віктар Петакоў [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. Т. Канстанцінава, В. Прыбылова, Т. Бяркові́ч. – Мінск, 2017. – 2 электрон. апт. дыскі (CD-ROM): гуч., брашура (39 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі ; вып. 9).

36. Валачобныя музычна-абрадавыя традыцыі беларусаў [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. Т. Канстанцінава. – Мінск, 2018. – 2 электрон. апт. дыскі (CD-ROM): гуч., брашура (39 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі ; вып. 10).

37. Каляндарна-песенная традыцыя Беларускага Панямоння ў экспедыцыйна-палявых запісах Л. П. Касцюкавец [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. Т. Канстанцінава, Н. Даніловіч. – Мінск, 2018. – 2 электрон. апт. дыскі (CD-ROM): гуч., брашура (39 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі; вып. 11).

38. Этнамузычныя традыцыі паўночнабеларускага рэгіёна: Міёршчына [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. акадэмія музыкі ; склад. Т. Бяркові́ч, Т. Канстанцінава. – Мінск, 2021. – 2 электрон. апт. дыскі (CD-ROM): гуч., брашура (51 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі ; вып. 14).

*Фальклорныя песенныя зборнікі*

39. Беларускі народны спеўнік: каляндарна-абрадавыя песні / аўт. ідэі Я. Грыневіч ; уклад.: Я. Грыневіч, Т. Канстанцінава ; рэдагаванне напеваў: Т. Канстанцінава. – Мінск : Капітал Прынт, 2025. – 136 с.

# РЭЗЮМЭ


**Канстанцінава Таццяна Леанідаўна**
**Абходныя песенна-віншавальныя традыцыі ў каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі**

**Ключавыя словы:** рытуальны абход, каляндарна-абрадавы цыкл, паўночнабеларускі рэгіён, крывічы, калядны напеў, валачобны напеў, тыпалагічная група напеваў, арэал.

**Мэта даследавання:** раскрыццё функцыянальнай, тыпалагічнай і арэальнай спецыфікі песеннага кампанента паўночнабеларускіх віншавальных абходаў каляндарна-абрадавага цыкла.

**Метады даследавання:** сістэмны, комплексны, структурна-тыпалагічны, функцыянальны, картаграфічны, арэальны, кампаратыўны, музычна-стылістычнага аналізу.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** дысертацыя з'яўляецца першым у этнамузыкалогіі сістэмным вывучэннем паўночнабеларускіх песенна-віншавальных абходаў каляндарнага замацавання, а таксама цэласным арэальным даследаваннем, скіраваным на раскрыццё тыпалогіі мелаарэалаў і іх гісторыка-культурную інтэрпрэтацыю; упершыню распрацавана тэорыя абходнага рытуалу; выяўлена сістэмаўтваральная функцыя абходаў і сезонная дынаміка іх тыпаў у каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі; вызначана спецыфіка музычнага кампанента паўночнабеларускіх калядных і велікодных абходаў у рэаліях XX – XXI стст., функцыянальныя значэнні і тыпалогія калядных і валачобных напеваў; раскрыты з пазіцыі музычнай арэалогіі асаблівасці ранняй стадыі фарміравання каляднай і валачобнай песенных традыцый беларусаў; даказана глыбінная сувязь тэрыторый Беларускага і Рускага Паазер'я на ўзроўні архаічных па фарміраванні абходна-песенных практык; устаноўлены цэнтр паўночнабеларускага каляднага і валачобнага песеннага масіву – традыцыя заходнядзвінскага правабярэжжа.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца як тэарэтычная база па тэме абходных рытуалаў, метадалагічная аснова арэальных даследаванняў у народазнаўстве, пры распрацоўцы праблем тыпалогіі, рэгіяналістыкі, жанрава-функцыянальнай і лакальна-стылявой спецыфікі этнамузычных традыцый, фарміраванні стратэгіі па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, у навучальным працэсе ўстаноў адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў, у стварэнні вучэбнай і даведачнай літаратуры.

**Галіна прымянення:** этнамузыкалогія, мастацтвазнаўства, фалькларыстыка, этналогія, музычная адукацыя.

## РЕЗЮМЕ

**Константинова Татьяна Леонидовна**
**Обходные песенно-поздравительные традиции в календарно-обрядовом цикле Северной Беларуси**

**Ключевые слова:** ритуальный обход, календарно-обрядовый цикл, северобелорусский регион, кривичи, колядный напев, волочёбный напев, типологическая группа напевов, ареал.

**Цель исследования:** раскрытие функциональной, типологической и ареальной специфики песенного компонента северобелорусских поздравительных обходов календарно-обрядового цикла.

**Методы исследования:** системный, комплексный, структурно-типологический, функциональный, картографический, ареальный, компаративный, музыкально-стилистического анализа.

**Полученные результаты и их новизна:** диссертация является первым в этномузыкологии системным изучением северобелорусских песенно-поздравительных обходов календарного закрепления, а также целостным ареальным исследованием, направленным на раскрытие типологии мелоареалов и их историко-культурную интерпретацию; впервые разработана теория обходного ритуала; выявлена системообразующая функция обходов и сезонная динамика их типов в календарно-обрядовом цикле Северной Беларуси; определена специфика музыкального компонента северобелорусских колядных и волочёбных обходов в реалиях XX – XXI вв., функциональные значения и типология колядных и волочёбных напевов; раскрыты с позиции музыкальной ареалогии особенности ранней стадии формирования колядной и волочёбной песенных традиций белорусов; доказана глубинная связь территорий Белорусского и Русского Поозерья на уровне архаических обходно-песенных практик; установлен центр северобелорусского колядного и волочёбного песенного массива – традиция западнодвинского правобережья.

**Рекомендации по использованию:** результаты исследования могут использоваться как теоретическая база по теме обходных ритуалов, методологическая основа ареальных исследований в народоведении, при разработке проблем типологии, регионалистики, жанрово-функциональной и локально-стилевой специфики этномузыкальных традиций, формировании стратегии по сохранению нематериального культурного наследия Беларуси, в учебном процессе учреждений образования в сфере культуры и искусств, в создании учебной и справочной литературы.

**Область применения:** этномузыкология, искусствоведение, фольклористика, этнология, музыкальное образование.

## RESUME

**Konstantinova Tatiana Leonidovna**
**Song-congratulatory Traditions of Circumventions in the Calendar-ritual Cycle of Northern Belarus**

**Keywords:** circumvention, calendar-ritual cycle, Northern Belarusian region, Krivichi, “kalyadny” tune, “valachobny” tune, typological group of tunes, area.

**Purpose of the study:** disclosure of the functional, typological and areal specificity of the song component of the North Belarusian congratulatory circumventions of the calendar-ritual cycle.

**Research methods:** system, complex, structural-typological, functional, cartographic, areal, comparative, musical-stylistic analysis.

**The received results and their novelty:** the dissertation is the first in ethnomusocology system study of the North Belarusian song congratulatory circumventions of the calendar-ritual cycle and also holistic areal study, aimed at revealing the typology of meloareals and their historical and cultural interpretation; the theory of the circumvention rituals has been developed for the first time; the system-forming function of circumventions and the seasonal dynamics of their types in the calendar-ritual cycle of Northern Belarus have been identified; the specificity of the musical component of Northern Belarusian Carol and Easter circumventions in the realities of the 20th – 21st centuries, like as functional meanings and typology of “kalyadny” and “valachobny” tunes have been determined; the peculiarities of the early stage of formation of “kalyadny” and “valachobny” song traditions of the Belarusians has been revealed from the point of view of musical arealogy; the deep connection between the territories of the Belarusian and Russian Poozerie has been proven at the level of archaic circumvention song practices; the center of Northern Belarusian “kalyadny” and “valachobny” song array has been established – tradition of the Western Dvina right bank.

**Recommendations for use:** the results of the study can be used as a theoretical basis on the topic of bypass rituals, a methodological basis for area studies in ethnological sciences, in the development of problems of typology, regional studies, genre-functional and local-style specifics of ethnomusical traditions, in the formation of a strategy for the preservation of the intangible cultural heritage of Belarus, in the educational process of educational institutions in the field of culture and arts, and the creation of educational and reference literature.

**Field of application:** ethnomusicology, art history, folklore studies, ethnology, music education.

Падпісана ў друк 20.10.2025. Фармат 60/84 1/16.
Папераа офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. ар. 1.86. Ул.-выд. ар. 1.92
Тыраж 60 экз. Заказ № 148
Надрукавана з арыгінал-макета аўтара.
Прыватнае прадпрыемства «СіДзіТэхна».
220004, г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 23/1, оф. 414